Силивончик К.И, студент 314 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Котович О.В.,
старший преподаватель

# СВЯТА «ДАЖЫНКІ»: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

Культура беларусаў цесным чынам звязана земляробствам. Нездарма навукоўцы назвалі беларускі народны каляндар земляробчым [2], які зафіксаваў святы, звычаі і традыцыі нашых продкаў. З цягам часу змест старажытных свят губляецца, некаторыя з іх адыходзяць у нябыт. Аднак Дажынкі – свята, прысвечанае заканчэнню збору ўраджаю, вяршыня гаспадарчай дзейнасці земляроба, – і па сённяшні дзень не страціла сваёй актуальнасці.

Збор збажыны – важная падзея ў жыцці беларуса-селяніна, таму што менавіта злакавыя культуры былі крыніцай яго жыцця і дабрабыту. Дажынкі ў асноўным з'яўляліся сямейным святам, у яго абрадах бачна тая павага і шанаванне, якія селянін надаваў хлебу.

Асноўныя жніўныя абрады беларусаў падзялялі на тры этапы: Зажынкі, Жніво – асноўны час, прысвечаны збору ўраджаю, і Дажынкі – заключны этап. У агульных рысах жніўныя абрады, адбываюцца амаль аднолькавым чынам па усёй Беларусі, адрозніваючыся толькі некаторымі, больш ці меньш цікавымі асаблівасцямі па мясцовасцях. У нашай ўвазе будзе заключны этап гэтага шматэтапнай з'явы – Дажынкі або Абжынкі.

Дажынаць апошні загон выходзілі талакой. Дзеля гэтага запрашалі некалькі спрытных жней, якія павінны былі пакінуць на ім невялікую колькасць каласкоў лепшага жыта. Калі справа набліжалася да завяршэння, выконвалі абрад “Завіванне барады”: “Канчаючы жніво, адна частка жней зразала жыта каласамі і пачынала спяваць “раёк”, другая частка асобна ад іх

садзілася перад пакінутым кустком жыта і памагала спяваць, а адна з дзяўчат палола “роя”: вырывала траву з недажатага кусціка. Канчалі палоць і віць вянок разам. Калі вянок ужо звіты, тады тая, што палола, вырывала адну саломіну і звязвала ў адно ўвесь кусцік каля самых каласоў, што называлі “раёвай”, або “барадой”, а ў сярэдзіну кусціка клалі хлеб і соль” [2, с. 267]. Пасля гэтага з песнямі ішлі да хаты гаспадара, чый загон дажыналі. Да іх выходзіў гаспадар. Тая дзяўчына, што заплятала “роя”, ускладала яму на галаву вянок. У хаце ўсіх чакала багатая вячэра, “прыходзілі музыкі, і пачыналіся гульні і танцы да позняга часу” [2, с. 268].

Акрамя так званай “барады” – падзякі ніве за сабраны ўраджай, жнеі дажыналі апошні сноп, які як і першы, меў вялікае значэнне ў рытуальнай практыцы ўсходніх славян”. Неабходна адзначыць, што ў адных рэгіёнах вяршэнства аддавалі першаму снапу, у іншых апошняму [4, с. 552]. А. Катовіч і Я. Крук адзначаюць: “Як дарагога госця сноп сустракалі ўсёй сям’ёй на парозе дома, а затым пад акампанемент хору жанчын-жней, якія выконвалі спецыяльныя абрадавыя песні, урачыста ўносілі ў дом і ставілі ў чырвоны кут пад абразом – на покуці” [3, с. 299]. Па сведчаннях Т.В. Валодзінай і Т.І. Кухаронак “апошні сноп, як і першы, упрыгожвалі, урачыста неслі да хаты, дзе ён стаяў на ганаровым месце побач з зажынкавым, пасля іх асвячалі ў царкве на адно з восеньскіх рэлігійных святаў, зерне бралі на засеўкі – “…каб кожды год радзіў такі ўражай, як з гэтага снапка, – бо, паводле традыцыйных вераванняў, зярняты апошняга снапа лічыліся найбольш урадлівымі” [1, с. 294].

Шматлікія звычаі, абрады, вераванні, прыкметы Зажынак і Дажынак, яркія жніўныя атрыбуты – першы і апошні сноп, дажынкавы вянок – доўгі час захоўваліся і пры калгасным ладзе. Іх уручалі кіраўнікам гаспадарак, якія па традыцыі абавязаны былі пачаставаць працаўнікоў, зладзіць для калгаснае гулянне.

Змяненне ўмоў працы, выкарыстанне тэхнікі і новых тэхналогій разам са змяненнем традыцый у цэлым, аказалі ўплыў і на старадаўнія абрады. Значна скарацілася колькасць удзельнікаў жніва. Калі раней галоўнымі дзеючымі асобамі былі жнеі, то ў новых умовах галоўнымі сталі камбайнеры, механізатары, працаўнікі зернетокаў і г. д.

У 1997 выйшла першая пастанова Саўміна ад 11 ліпеня 1996 года “Аб мэтазгоднасці правядзення... <> рэспубліканскай кірмашу працаўнікоў вёскі”. І менавіта так у выніку і стала называць свята збору ўраджаю: Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі “Дажынкі”. Як сцвярджаюць А. Курец і А. Цыбулько: “Ідэя адрадзіць такі абрад, зрабіць больш паважаным і шанаваным працу хлебароба належыць Аляксандру Лукашэнку. Прэзідэнт абавязкова прысутнічаў на кожным фестывалі і не толькі асабіста ўшаноўвалі хлебаробаў, якія занялі першыя месцы, але і аналізаваў зробленае, ставіў задачы на будучыню. Сяляне чакалі гэтых слоў, яны адразу адчулі даніну павагі да сваёй высакароднай працы. А правядзенне такіх маштабных мерапрыемстваў стала важнай вяхой на шляху да вялікага хлеба” [5]. Гораду, якому выпадаў гонар прымаць гэты фестываль, “шанцавала”: на працягу года, які папярэднічаў фестывалю, у горадзе праводзілася маштабная рэканструкцыя асноўных вуліц, будаваліся спартыўныя комплексы, культурныя цэнтры і інш. Першыя адроджаныя “Дажынкі” прайшлі ў 1996 годзе ў Століне Брэсцкай вобласці. На гэтым мерапрыемстве прысутнічаў прэзідэнт. Падчас віншаванняў герояў жніва, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на зямлі няма такога нялёгкага і ў той жа час ганаровага справы, як праца хлебароба [6].

З 1996 па 2014 гады фестываль праводзіўся ў  такіх гарадах нашай краіны як Столін, Масты, Нясвіж, Шклоў, Мазыр, Полацк, Пружаны, Ваўкавыск, Слуцк, Бабруйск, Рэчыца, Орша, Кобрын, Ліда, Маладзечна, Горкі, Жлобін і Гарадок. Традыцыйна свята пачынаецца з шэсця ўдзельнікаў па цэнтральнай вуліцы горада-гаспадара, праходзіць два, а то і тры дні. На

фестывалі-кірмашы будуць ушаноўваць пераможцаў рэспубліканскіх спаборніцтваў за дасягненне высокіх паказчыкаў па ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур, нарыхтоўцы травяных кармоў, вырошчванні лёну і ў вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі. Узнагароджваюць лепшых камбайнераў і вадзіцеляў, пасля чаго пачынаецца канцэрт фальклорных і папулярных калектываў. У горадзе дэманструецца сельскагаспадарчая прадукцыя і тэхніка, праводзяцца народныя гульні і гулянні. Пераможцы спаборніцтваў вязуць з галоўнага свята ўраджаю грашовыя прэміі і каштоўныя падарункі.

Пачынаючы з 2015 года, Рэспубліканскае свята “Дажынкі” змянілі свой фармат: з дзяржаўнага ўзроўню на лакальны. Цяпер фестываль арганізуецца ў адным з раённых цэнтраў Беларусі кожнай вобласцю самастойна. Аднак, значнасць свята не стала меней. Маштабнае святкаванне “Дажынак”, падчас якога  праслаўляецца чалавек працы, сярод краін постсавецкага часу, характэрна толькі для Рэспублікі Беларусь.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Валодзіна, Т.В. «Ядраное жыта гаспадара кліча...»: каляндарны год у абрадах і звычаях / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак Мінск : Беларуская навука, 2015. – 358 с.
2. Земляробчы каляндар: абрады і звычаі / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; [рэд. кал.: В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік (гал. рэд.) ; уклад., класіфікацыя, сіст. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.
3. Котович, О. Крук, Я. Сакральный мир традиции 99 уроков народной культуры / О Котович, Я Крук. – Минск : , 2019. – 576 с.

4. Усачёва, В. В. Колос / В. В. Усачёва // Славянские древности : Этнолингвистический словарь в 5-ти томах / под общ. Ред. Н. И. Толстого. – Т. 2 : Д – К (Крошки), – М. : Междунар. отношения, 1999. – С. 552–556.
5. Первые “Дожинки” [Электронный ресурс]. – Режим доступа http://25.by/1996/dozhinki
6. Дожинки: от обряда к современному празднику [Электронный ресурс]. – Режим доступа https://peskiadmin.ru/scenarii-prazdnichnogo-gulyaniya-gulyai-lyudi-veselei-samovaru.html

Сипайло Т.К., студент 150 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Бомбешко И.И.,
кандидат культурологии, доцент кафедры

## ГЕНРЫХ ХРЫСТАФОРАВІЧ ТАТУР ЯК АРХЕОЛАГ, КРАЯЗНАВЕЦ, КАЛЕКЦЫЯНЕР

З гісторыяй горада Мінска звязана шмат знакавых імён, адно з іх – археолаг, краязнавец і калекцыянер Генрых Хрыстафоравіч (па іншых крыніцах – Хразастомавіч) Татур, на якім мы падрабязна засяродзім нашу ўвагу. Г. Х. Татур нарадзіўся ў Слоніме 17 верасня 1846 г. у сям’і Хрызастома-Лаўрэнція-Дамініка Іванава Татура, маршалка Слонімскага павятовага дваранства. Інфармацыя аб маці Г. Х. Татура вельмі сціслая. У Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы захоўваецца ліст 1884 г. з узгадваннем маці даследчыка Ганны, якая пэўны час навучалася ў жаночым пансіёне ў Варшаве [16]. На жаль, фатаграфічныя выявы Г. Х. Татура даследчыкамі пакуль не выяўлены, вядома толькі моўнае апісанне яго знешнасці.